*Historia est magistra vitae.*
*M.T. Cicero*

*Гісторыя – настаўніца жыцця.*
*М.Т.Цыцэрон*

# ГУРТ

Газета студэнцкага навукова-даследчага гісторыка-краязнаўчага гуртка
**№11** **снежань, 2006**



## У НУМАРЫ:

Нашы юбіляры:
Я.Н. Мараш
С. – 2
І.П. Крэнь
С. – 3
Горад як аб'ект даследавання
С. – 4
Мы – з гарадской цывілізацыі
С. – 4-5
Ганаровы вязень
С. – 6
Новыя кнігі
С. – 7
450-годдзе Льва Сапегі
С. – 7
Пункт гледжання
С. – 8

У канцы кастрычніка адбылася экскурсія па маршруту Гродна-Мураванка-Шчучын-Ліда-Іўе-Гальшаны-Баруны-Крэва. У пагожы восеньскі дзень каля 40 студэнтаў гістарычнага факультэта – сярод іх і гурткоўцы – здзейснілі найцікавейшае падарожжа па славутых мясцінах нашага краю. Мы змаглі пабачыць і дакрануцца да муроў Лідскага замка XIV ст. і знакамітай царквы-крэпасці пачатку XVI ст. у Мураванцы. Абследавалі звонку і ўнутры палац Любамірскіх у Шчучыне і Іўеўскую мячэць. Наведалі музей ў Гальшанах і аблазілі руіны легендарнага Гальшанскага замка XVII ст. Мясцовы ксёндз правёў для нас экскурсію па знакамітаму Барунскаму касцёлу – помніку архітэктуры віленскага барока (XVIII ст.). У час паездкі адбыліся цікавыя сустрэчы з настаяцелем мясцовага касцёла у Шчучыне, мулой з Іўя, гісторыкамі з Гальшан. Амаль праз дзесяць гадзін шляху мы ўрэшце дасягнулі канечнай і, здаецца, галоўнай мэты нашай вандроўкі – Крэўскага замка. Нават руіны яго ўражваюць сваёй веліччу. Завяршылася экскурсія на Юравай гары. У краявідах Крэва і яго ваколіц, якія на многія кіламетры былі відаць з гэтай гары: царква, касцёл, возера, лес, палі, – для нас, якія ў гэты дзень дакрануліся да каштоўнейшых святынь беларускай гісторыі, нібы ўвасобіўся вобраз усёй нашай Радзімы. Агульны прыўзняты настрой, натхненне, атрыманае ад ўбачанага, выказаў першакурснік Аляксандр Горны: "Гэта - мая Радзіма. Яна такая вялікая і прыгожая. Я ёй ганаруся і ўсё зраблю каб яна стала яшчэ велічней".

...На Крэва, на гару, з якой нам ніяк не хацелася зыходзіць, апускаўся ранні кастрычніцкі вечар. Цямнела. Стомленыя, насычаныя ў гэты дзень гісторыяй, адчуўшыя яе подых, мы вярталіся да аўтобуса. Нас яшчэ чакалі сотні кіламетраў зваротнага шляху...

# Нашы юбіляры: Я.Н. Мараш

7 студзеня 2007 г. – 90-годдзе заснавальніка гісторыка-краязнаўчага гуртка доктара гістарычных навук, прафесара Якава Навумавіча Мараша [25.12.1916 (7.1.1917)– 25.9.1990].

Я.Н.Мараш – ураджэнец Гродна. Закончыўшы ў 1936 г. Гродзенскую гімназію, ён паступіў на гістарычны факультэце Віленскага універсітэта, потым вучыўся ў Львоўскім універсітэце, дзе і атрымаў у 1940 г. дыплом гісторыка. Працаваў настаўнікам гісторыі ў Заходняй Украіне, потым – у Расіі. У 1945 г. ён вярнуўся ў Гродна – горад, які ён не проста любіў, але і вельмі шанаваў за яго багацейшую гісторыю. З 1946 г. лёс назаўсёды звязаў яго з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам (да 1978 г. – педагагічны інстытут). Тут ён працаваў выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам, дэканам гістарычнага факультэта, загадчыкам кафедры гісторыі СССР і БССР. У 1954 г. абараніў у Беларускім дзяржаўным універсітэце кандыдацкую, у 1973 г. – доктарскую дысертацыю. Пяру Якава Наумавіча належыць больш за 20 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, больш за 500 артыкулаў. Асноўнай тэмай яго навуковых даследаванняў была гісторыя каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі (пераважна XVI–XVIII ст.). Ён распрацоўваў таксама пытанні методыкі выкладання гісторыі ў сярэдняй і вышэйшай школе. Шмат займаўся гістарычным краязнаўствам. Прызнаннем яго заслуг былі званне “Выдатнік народнай адукацыі БССР”, граматы Міністэрства адукацыі і інш.



Сваімі ўспамінамі пра прафесара Я.Н.Мараша дзеліцца яго вучаніца доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі **С.В.Марозава**:

Лёс падараваў шмат добрых, разумных, прыстойных людзей на маім жыццёвым шляху. Мой “навуковы бацька” – а менавіта так мы называлі ў сям’і прафесара Мараша – займае асаблівае месца ў маім жыцці. Інтэлектуал, паліглот, класічны інтэлігент “старой загартоўкі” (выхаванец класічных Віленскага і Львоўскага універсітэтаў), прызнаны вучоны, педагог з вялікай літары…

У мае студэнцкія і аспіранцкія гады Якаў Навумавіч быў маім навуковым кіраўніком. Пад яго “начальніцкай”, педагагічнай і проста бацькоўскай, апекай адбывалася маё прафесійнае станаўленне як выкладчыка. Ужо тады мы – тыя, хто вучыўся і пачынаў працаваць пад яго – не, нават не начальствам, але апекай, – разумелі, што гэта незвычайны, асаблівы чалавек, не такі, як усе. Як мудры кормчы, ён упэўнена, тактоўна, добразычліва і бескарысліва вёў нас па лабірынтах навуковага і педагагічнага шляху. З ім заўсёды было добра і камфортна. Я была нікім і нічым, а ён успрымаў мяне як роўнага сабе калегу. Мы яго не проста паважалі – ўшаноўвалі. Будучы ў Мінску, нават даводзілася чуць: “Вы там своего Мараша обоготворяете”. Дысертацыйныя перадабарончыя клопаты і сама абарона па-новаму адкрылі мне гэтага чалавека. Была тады моцна ўражана яго высокім аўтарытэтам у навуковых колах гісторыкаў Беларусі, Літвы, Украіны.

У 1990 г. Якаў Навумавіч упершыню “выправіў” мяне на ўсесаюзную навуковую канферэнцыю, аж у Маскву – выступаць ад імя дваіх. Кожны пісаў сваю частку выступлення. Ён гэта рабіў у бальніцы – працаваў і там. Гэта былі яго апошнія дні…

Потым паўстала пытанне: хто будзе кіраваць студэнцкім навукова-даследчым гісторыка-краязнаўчым гуртком, які ён заснаваў у год адкрыцця гістарычнага факультэта (1954 г.) і якім нязменна кіраваў 35 год. Усёй кафедрай разумелі, што працягнуць яго пачынанне – справа нашага гонару. Але гэта не была звычайная нагрузка – гэта было яго дзецішча. Пра гэты гурток былі нават выдадзены дзве кніжкі. Прапанавалі мне як яго вучаніцы. Я ад такой прапановы нават спужалася. Гурток трымаўся на яго выключным навуковым аўтарытэце і педагагічным вопыце. Ці змагу я дастойна працягнуць справу прафесара? З таго часу ў гуртка – два кіраўнікі. Сёння для мяне гісторыка-краязнаўчы гурток – гэта найперш частка майго настаўніка, яго душы, яго спадчыны, даніна маёй павагі да яго, схіленне перад яго памяццю. Ганаруся тым, што выпала працягваць яго справу.

Час аддае забыццю мізэрнае і ўзвялічвае значнае. Гады яшчэ больш акрэслілі веліч постаці вучонага і педагога, які быў і застаецца адной з ключавых фігур на гістарычным факультэце і ва універсітэце. Яго дзейнасць – гэта і важкі факт гісторыі нашага горада і вобласці, дзеля якіх ён шмат зрабіў, каб людзі ведалі багацейшую гісторыю Панямонскага краю. Працы прафесара Мараша – з’ява беларускай гістарыяграфіі. Асабісты фонд і бібліятэка вучонага ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці служаць мэтам навукі. Рэліквіямі сталі падораныя ім кнігі. У рэспубліканскай прэсе рэгулярна з’яўляюцца артыкулы да юбілейных дат Якава Навумавіча. Рыхтуецца да выдання кніга пра гродзенскага гісторыка. Распачатае ім даследаванне гісторыі рэлігіі і царквы стала вядучым навуковым напрамкам кафедры гісторыі Беларусі. А гісторыка-краязнаўчы гурток, які працягвае выконваць свае функцыі кузні навуковых кадраў гісторыкаў для Беларусі, адзначыў 50-годдзе. Дзе яшчэ ў рэспубліцы працуе студэнцкі гурток з паўвекавой гісторыяй? Справы прафесара працягваюць наступныя пакаленні. Ну а тое, што я цяпер маю: вучоную ступень, педагагічны досвед, прызнанне ў навуковым свеце – былі закладзены галоўным у маім жыцці настаўнікам.

# Нашы юбіляры: І.П. Крэнь



30 лістапада 2006 года споўнілася 70 гадоў кандыдату гістарычных навук, прафесару, загадчыку кафедры гісторыі Беларусі І.П.Крэню. І.П.Крэнь – заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы.

Іван Платонавіч – ураджэнец Брэсцкай вобласці. Яго дзяцінства прыпала на цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады. Ён рана застаўся без бацькоў, але настойліва імкнуўся атрымаць адукацыю. Закончыўшы ў 1954 г. школу, дапытлівы юнак паступіў на гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, дзе атрымаў дыплом настаўніка гісторыі, рускай мовы і літаратуры. Потым 8 гадоў працаваў настаўнікам і дырэктарам у школах Радуньскага і Воранаўскага раёнаў, адначасова завочна вучыўся ў аспірантуры Белдзяржуніверсітэта імя Леніна. У 1967 г. запрошаны на працу ў сваю альма-матэр, працаваў старшым выкладчыкам, дацэнтам, сакратарам парткама інстытута, дэканам факультэта гісторыі і культуры. У 1981 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1991 г. атрымаў вучонае званне прафесара. З 1990 г. працуе загадчыкам кафедры гісторыі Беларусі.

За апошнія 16 гадоў ва ўсю шырыню праявіліся навукова-педагагічныя і арганізатарскія здольнасці прафесара. Ён стаў сапраўдным лідэрам кафедры і факультэта, таленавітым арганізатарам навукі. Пад яго кіраўніцтвам кафедра гісторыі Беларусі стала адным з самых аўтарытэтных навуковых і навукова-педагагічных цэнтраў рэспублікі. На кафедры сёння працуюць 2 доктары, 2 прафесары, 14 дацэнтаў і 19 кандыдатаў гістарычных навук. Іх сіламі за апошнія гады распрацавана і выдадзена больш за 30 дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Іванам Платонавічам асабіста і з яго ўдзелам, пад яго кіраўніцтвам, агульнай і навуковай рэдакцыяй апублікаваны 12 навучальна-метадычных і вучэбных дапаможнікаў.



Асноўная тэматыка навуковых публікацый І.П.Крэня, а іх больш за 320, звязана з эканомікай і культурай Беларусі, гісторыяй грамадскіх рухаў, палітычных партый і арганізацый, гісторыяй гарадоў і сёл, гісторыка-дакументальнымі хронікамі “Памяць”. Ім арганізавана і праведзена 15 рэгіянальных гісторыка-краязнаўчых канферэнцый, шэраг міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый, па выніках якіх выдадзены зборнікі навуковых матэрыялаў.

Штогод кафедра гісторыі Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара І.П.Крэня арганізуе і праводзіць міжвузаўскія студэнцкія навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Падрыхтаваныя пад яго кіраўніцтвам навуковыя работы студэнтаў на рэспубліканскіх аглядах-конкурсах атрымоўваюць высокія ўзнагароды.

І.П.Крэнь узначальвае магістратуру і аспірантуру ва універсітэце па айчыннай гісторыі. Ім падрыхтаваны 11 кандыдатаў і 2 магістры навук. Прафесар І.П.Крэнь паспяхова працягвае справу прафесараў Б.М.Фіха і Я.Н.Мараша, якія заклалі на кафедры асновы навуковай школы.

Кафедра гісторыі Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара І.П.Крэня па праву займае лідзіруючае становішча сярод факультэцкіх кафедр, а ў 2004 і 2005 г. выходзіла пераможцам сярод універсітэцкіх кафедр. На кафедры выконваецца 5 дзяржбюджэтных тэм.

За вялікі ўклад у развіццё гістарычнай навукі, падрыхтоўку педагагічных і навукова-педагагічных кадраў Іван Платонавіч узнагароджаны нагрудным знакам “Выдатнік народнай адукацыі БССР”, шэрагам ганаровых грамат рэктарата і Міністэрства адукацыі, Ганаровай граматай Савета Міністраў і Ганаровай Граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Івану Платонавічу прысвоена ганаровае званне “Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь” і “Ганаровы прафесар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы”.

***І.І.Коўкель, прафесар***

***

З 1990 г. І.П.Крэнь кіруе гісторыка-краязнаўчым гуртком. Гурткоўцы віншуюць Івана Платонавіча са слаўнай жыццёвай датай. Жадаем Вам моцнага здароўя, радасці працы і адпачынку, а таксама новых творчых поспехаў у вашай нялёгкай, але высакароднай дзейнасці на ніве народнай асветы.

# Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры

Рэспубліканская навуковая канферэнцыя пад такой назвай прайшла 3 лістапада 2006 г. на гістарычным факультэце. Яна была арганізавана кафедрай гісторыі Беларусі. Заяўкі на канферэнцыю падалі 100 чалавек. У ёй прынялі ўдзел як вядомыя вучоныя, так і аспіранты, магістранты, студэнты з Гродна, Мінска, Віцебска. На адкрыцці канферэнцыі выступіў першы прарэктар ГрДУ імя Я. Купалы прафесар А.М.Нечухрын. Ён адзначыў слабую распрацаванасць працэсаў урбанізацыі, пачынаючы з XIII ст. да нашага часу.

На канферэнцыі працавалі 3 секцыі: 1) Гарады Беларусі з часоў ранняга сярэднявечча да канца XVIII ст.; 2) Гарады Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі (канец XVIII – 1917 г.); 3) Гарады Беларусі ў найноўшы час.

На іх разглядалася шырокае кола пытанняў урбаністыкі Беларусі: археалагічнае даследаванне гарадоў, роля магдэбургскага права ў развіцці гарадоў, гарадская культура, роля горада ў эканамічным развіцці краіны і інш. Абмяркоўваліся праблемы тэрміналагічныя, канцэптуальнага характару, метадалагічных падыходаў.



Вялікую цікавасць выклікалі даклады прафесара З.В.Шыбекі, дацэнтаў Л.Р.Казлова, А.Ф.Самусіка і іншых даследчыкаў з Мінска, а таксама гродзенскіх вучоных дацэнтаў Г.М.Семянчука, І.В.Соркінай, І.Ф.Кітуркі і інш.

У канферэнцыі прынялі ўдзел і гурткоўцы. Тэкст выступлення пяцікурсніка Сяргея Занеўскага, які займаецца пытаннямі грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст., пад назвай "Кароль у Гродна: ўладар ці палонны?" прапануецца вашай ўвазе на старонцы 6.

Канферэнцыя выклікала станоўчы рэзананс ў навуковых колах рэспублікі. Мяркуецца, што матэрыялы канферэнцыі, якія рыхтуюцца да друку, стануць укладам ў распрацоўку праблем урбаністыкі ў Беларусі.

*******************

## Беларускі шлях да гарадской цывілізацыі

Удзельнік Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры" доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта **З.В. Шыбека** – спецыяліст па ўрбаністыцы. Ён – аўтар манаграфіі "Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў)" ( Мн., 1997). З.В.Шыбека выступіў перад студэнтамі V курса, якія слухаюць спецкурс "Праблемы ўрбанізацыі Беларусі ў XIX – пачатку XX стст." Фрагменты яго выступлення, якія ўдалося заканспектаваць, – да ўвагі чытачоў "ГУРТа".

Мы – гараджане, прывыклыя да гарадскога пейзажу і побыту. Мы – з гарадской цывілізацыі. Але ці задумваемся – калі ж прыйшла да нас гэтая цывілізацыя? Якім чынам прыжылася на беларускай зямлі? Наколькі камфортна нам у горадзе? На маю думку, гарадская цывілізацыя ў Беларусі канчаткова не ўсталявалася.

У беларускіх гарадах, паводле перапісу 1999 г., пражывае каля 69% насельніцтва. Большасць грамадзян Беларусі штодзённа карыстаецца здабыткамі гарадской цывілізацыі. Тым не менш, мы застаемся вясковай нацыяй, калі мець на ўвазе не толькі матэрыяльны, але і духоўны бок гарадской цывілізацыі. Вяскоўцы, якія панаехалі ў гарады, яшчэ не паспелі стаць гараджанамі. І ў гарадскіх кватэрах яны жывуць вясковымі клопатамі, думаюць па-вясковаму.

Чаму ж гарадская цывілізацыя не агарнула, як след, жыхароў Беларусі? Відаць таму, што урбанізацыя Беларусі была недасканалай ці незавершанай.

Імклівая урбанізацыя краін Заходняй Еўропы, гэта значыць павялічэнне колькасці гараджан коштам вяскоўцаў, пачалася з канца XVIII ст. Узрастала роля гарадоў. Урбанізаваўся побыт людзей, урбанізоўвалася і іх мысленне. І якраз тады ВКЛ, у склад якога ўваходзілі беларускія землі, вельмі не пашчасціла. Яно выпала з гэтага працэсу. Разбурэнне гарадской інфраструктуры ў выніку няспынных войнаў з суседзямі істотна аслабіла Вялікае Княства Літоўскае і стала адной з прычын яго далучэння да Расійскай імперыі.

Ва ўмовах Расіі урбанізацыя запаволілася, а галоўнае -- абмінала карэнную нацыю – беларусаў. У складзе Расіі мясцовыя гарады пазбаўляліся былога незалежнага ад дзяржавы самакіравання і выкарыстоўваліся як найбольш эфектыўная зброя русіфікацыі беларуска-літоўскіх губерняў. Па-другое, стварaліся невыносныя ўмовы для пашырэння праслойкі мяшчан-хрысціян, будучых прадпрымальнікаў. Царскі ўрад фактычна закрыў для іх шлях да камерцыйнай дзейнасці, калі пазбавіў падатковых прывілегій і перапісаў у лік падатнага насельніцтва. Па-трэцяе, царызм паслядоўна не аддаваў гарады – гэтыя камандныя вяршыні кожнага грамадства – у рукі мясцовай зямельнай арыстакратыі. Не маючы сіл каланізаваць, ён "іудызаваў" іх. У канцы XIX ст. яўрэі складалі 53,5% гарадскога насельніцтва. Яўрэйскія гарадскія цэнтры менш палохалі царскі ўрад, як перспектыва ператварэння іх у "польскія", а фактычна беларускія.

А ў выніку істотна ўскладнялася фарміраванне беларускай нацыянальнай эліты. Па-чацвёртае, метадычна разбуралася адзінства гарадской абшчыны. Іўдзейскія, каталіцкія, праваслаўныя і магаметанскія абшчыны пастаянна нацкоўваліся адна на адну. І тым істотна запавольваўся працэс трансфармацыі этнічных элементаў краю ў адзіную беларускую нацыю.

У той час, як небяспечныя для самаўладдзя жыхары гарадоў усяляк абмяжоўваліся ў правах, жыхары вёсак падвяргаліся меншай дыскрэдытацыі і нават мелі падатковыя льготы. Таму мяшчане пакідалі гарады і перасяляліся ў вёскі.

Дабрадзейнасць царызма ў адносінах да беларускіх сялян мела пэўны палітычны сэнс. Прывязаныя да зямлі, яны адхіляліся ад небяспечных гарадскіх спраў. Іх свядомасць не урбанізавалася. Яны заставаліся шэрай, індыферэнтнай, паслухмянай масай і разглядаліся як этнаграфічны матэрыял для будаўніцтва рускай нацыі. У канцы XIX ст. у гарадах Беларусі пражывала каля 10% насельніцтва, тады як у гарадах Германіі і Францыі – каля 40%. Доля гараджан-беларусаў у той час не перавышала і 17%. Акрамя таго, мы пазбавіліся вартай сталіцы. Вільня ператварылася ў звычайны губернскі цэнтр Расійскай імперыі, хоць і самы буйны (154 тыс. чалавек у канцы XIX ст.). Мінск ніколі не заменіць Вільню. Гістарычны патэнцыял горада не дазваляе Мінску стаць у адзін шэраг з еўрапейскімі сталіцамі.

Савецкая індустрыялізацыя 60-х гадоў мінулага стагоддзя ператварыла гарадскіх жыхароў у большыню беларускага грамадства, змяніла склад гараджан на карысць беларускай нацыі. Аднак савецкія гарады служылі палігонам для масавай камунізацыі свядомасці мясцовага насельніцтва. Традыцыі буржуазнага горада вынішчаліся, а ўзамен ім насаджаліся ідэалы жыцця, фактычна сялянска-калгасныя. Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі ў 1991 г. структура гарадоў па-ранейшаму выкарыстоўвалася для навязвання каштоўнасцей савецка-беларускай культуры, вясковай па свайму паходжанню.



Так што гістарычныя абставіны не дазвалялі жыхарам Беларусі урбанізавацца па-еўрапейску. У нашым выпадку “вясковая свядомасць” часцей перамагала “свядомасць гарадскую”. Недаурбанізаваная свядомасць, ці ментальнасць, жыхароў Беларусі выяўляецца ў схільнасці да ўтопій і, у першую чаргу, да ўтопій сацыялістычных, у адсутнасці дастаткова заўважнай гістарычнай свядомасці, у адсутнасці дастаткова моцнага пачуцця нацыянальнай свядомасці і інш.

Сучасны гараджанін павінен усведамляць уласную місію, разумець грамадскую ролю горада. Своеасаблівасць гарадскога паселішча -- у прывілегіях і ільготах, якімі не валодаюць іншыя населеныя пункты. Гарады заўсёды былі і ёсць своеасаблівыя лабараторыі па самасцвярджэнню і самавыжыванню нацый. Толькі ў шчыльна населеных гарадах ствараецца незвычайна высокі эфект акумуляцыі новых ідэй і багаццяў. Гэты эфект тым большы, чым большы камунікацыйны патэнцыял горада, чым з большай колькасцю структур ён звязаны.

Лакальныя гарады прэзентуюць лакальную мясцовую культуру, лакальную традыцыю, лакальную грамадскую думку, лакальны эканамічны інтарэс. Тады як абласныя гарады, што ўзраслі на буйных рэгіёнах, прэзентуюць правінцыйную культуру, традыцыю, гарадскую думку, правінцыйную эканамічную салідарнасць. Сярод іх вылучаюцца лідэры нацыі, якія становяцца сталіцамі, і ўжо прэзентуюць культуру, эканоміку і грамадскую думку ўсёй нацыі. У іх завязваецца міжнародны дыялог, а таму і ступень акумуляцыі ідэй і багаццяў робіцца самай высокай. Адсюль выключная роля сталіц – вядучых камунікатараў нацыі.

З атрыманнем Беларуссю незалежнасці беларускі горад атрымаў большую сувязь з уласна нацыянальнай глебай. Ён стаў на чале адраджэння беларускай культурнай традыцыі. Раённыя гарадскія цэнтры становяцца асяродкамі народных рамёстваў, краязнаўчага руху. У абласных цэнтрах ажыццяўляюцца важныя рэгіянальныя інтэлектуальныя праекты – выставы, фестывалі, навуковыя канферэнцыі. Пашыраецца прыватнае прадпрымальніцтва. Ідзе стыхійны працэс адраджэння натуральнай інфармацыйнай і эканамічнай функцый гарадоў, калі кожны на сваім узроўні зноў пачынае прэзентаваць мясцовую культуру, традыцыю, эканоміку.

# Кароль у Гродна: ўладар ці палонны?

Адной з галоўных падзей у жыцці Гродна канца XVIII ст. стаў пераезд сюды апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Адразу пасля таго, як войска Аляксандра Суворова разграміла атрады паўстанцаў у прадмесці Варшавы, Кацярына II прапанавала манарху Рэчы Паспалітай як мага хутчэй пакінуць мяцежную сталіцу і пераехаць у горад на Нёмане. Аднак Панятоўскі не спяшаўся з выездам. Праз месяц, 24 лістапада 1794 г., імператрыца падпісала загад “Аб прыняцці і пасяленні караля польскага на жыхарства ў Гродне”. Свайму галоўнакамандуючаму князю Мікалаю Рапніну было ўказана прыняць да ўвагі, што хоць афіцыйнае далучэнне гэтых зямель да Расіі яшчэ не адбылося, кіраванне ў Гродне ажыццяўляецца імем і ўладай рускай імператрыцы, таму кароль ні ў якія справы ўваходзіць не павінен; за ім самім і за яго перапіскай належала ўстанавіць пільны нагляд. Прыставам да манарха быў прызначаны генерал-маёр граф Э. Безбародка, які атрымаў на гэты конт падрабязную інструкцыю. У якасці памяшкання Панятоўскаму быў адведзены Новы замак.

Генерал-губернатар эстляндскі, віленскі і слонімскі М. Рапнін, як асцярожны палітык, меў падставы для хвалявання. Ён не быў падрыхтаваны да прыняцця такога важнага госця, нават пераконваў Кацярыну II выслаць караля не ў Гродна, а ў Рыгу: “Баюся браць адказнасць за бяспечнае прыбывання караля. Калі ён будзе мець пры сабе сваіх блізкіх і шмат свабоды, тады ён можа наладзіць кантакты з ворагамі Расіі. Неаднаразова лёс нас пераконваў, што гэты манарх быў заўсёды шкодны нашым інтарэсам, не было ніводнага кроку ў Польшчы супраць планаў нашага Двара, які б ён ні ўзначальваў, хоць і не браў ў ім жывога ўдзелу. З гэтага вынікае, што кароль праз сваіх верных людзей паспрабуе звязацца толькі яму вядомымі шляхамі з замежнымі Дварамі і схіліць іх на свой бок. Баюся, што знаходжанне караля ў Гродна парушыць спакой гэтых мясцін”. Але расійская імператрыца не змяніла свайго рашэння. З пункту гледжання яе планаў і намераў, выбар Гродна, які яшчэ з мінулых стагоддзяў з’яўлялся другой сталіцай Рэчы Паспалітай, здаваўся найлепшым. Стваралася ўражанне, што кароль пераехаў на



Н. Лямір. Тагачасная карыкатура на падзел Рэчы Паспалітай

пэўны час з адной рэзідэнцыі ў другую.

Каралеўскі картэж выехаў з Варшавы 27 снежня 1794 г. Ён рухаўся паволі і дасягнуў Гродна амаль праз тыдзень, 2 студзеня 1795 г. у 12 гадзін. У двух вярстах ад горада картэж сустрэў генерал Цыцыянаў, які суправадзіў караля да замка. Разам з Панятоўскім прыехала 153 чалавекі світы. Прабыў ён тут два гады, да студзеня 1797 г.

К таму часу Гродна ужо пазбавіўся сваёй былой велічы, запусцеў. Пакінутыя сваімі гаспадарамі, што выехалі за мяжу, апусцела шмат будынкаў. Колькасць насельніцтва была на ўзроўні канца 1588 г.: чатыры тысячы жыхароў, якія пражывалі ў 815 дамах. Але пасля прыезду караля гарадское насельніцтва з-за вялікай колькасці “прасіцеляў” значна ўзрасло. “Прасіцелі” пачалі прыбываць ужо з першага дня знаходжання караля ў Гродна: прыходзілі са скаргамі, просьбамі аб пасрэдніцтве, з пажаданнямі да Рапніна, якія асцерагаліся выказваць яму напрамую.

Кацярына II загадала ставіцца да караля з вялікай пашанай. Адзінае, у чым ён быў абмежаваны, – не дазвалялася выязджаць далей гарадскіх ваколіц. Прагулкі, конныя і пешыя, заўсёды адбываліся ў суправаджэнні ваеннай аховы. Асабліва любіў кароль паездкі ў Ласосна. У Гродна караля наведвалі сёстры: Ізабэла Браніцкая і Людвіка Замойская. Летам 1795 г. пры яго двары з’явіліся спевакі з Італіі.

Аднак жыццё Панятоўскага ў горадзе над Нёманам не было такім радасным, як можа здацца. Ён разумеў, што фактычна знаходзіцца ў ганаровым зняволенні, і ўжо не меў аніякай ўлады. Найбольшым цяжкім для яго было падпісанне акта адрачэння ад трона. Да апошняга Станіслаў Аўгуст спадзяваўся, што яго дзяржава ўсё ж не знікне, і Прусія, у адпаведнасці са сваёй заявай, абароніць Рэч Паспалітую. Але марна.

25 лістапада 1795 г. пасля доўгіх ваганняў кароль быў вымушаны падпісаць адрачэнне: спачатку выпрошваў і плакаў, потым па просьбе сваіх сясцёр згадзіўся. Напісаўшы “Згодна ўласная волі”, зноў заплакаў. Нават М. Рапнін, які ўзводзіў яго на трон, а цяпер з гэтага трона здымаў, быў моцна ўражаны.

Здароўе былога манарха пасля адрачэння моцна пахіснулася. Многія з былых сяброў яму здрадзілі, з’ехалі ў Варшаву. Дэмаралізаваны, кінуты былымі падданымі, без падтрымкі, Станіслаў Панятоўскі звярнуўся за дапамогай да М. Рапніна. Той пісаў у Пецярбург: “Палажэнне караля кожны дзень пагаршаецца: з чалавека шчаслівага да глыбока няшчаснага. Сядзім з ім абодва, як вязні, калі ж будзе канец побыту караля?”

16 лістапада 1796 г. з Пецярбурга прыбыў у Гродна кур’ер з навіной аб смерці Кацярыны II. Новы імператар Павел I даў згоду на перавод Панятоўскага ў сталіцу імперыі. Апошні кароль Рэчы Паспалітай пакінуў горад на Нёмане 13 студзеня 1797 г. і больш ніколі сюды не вярнуўся.

*Сяргей Занеўскі,*
*студэнт V курса*



На гістарычным факультэце адбылася прэзентацыя манаграфіі дацэнта С.А.Піваварчыка **“Белорусские земли в системе фортификационного строительства Российской империи и СССР (1772–1941)”** (Гродно: ГрГУ , 2006. – 251с.). У прэзентацыі прыняў удзел гісторыка-краязнаўчы гурток. Кніга выклікала вялікую цікавасць. Аўтар згадзіўся даць інтэрв’ю для нашай газеты.

*Чаму вас зацікавіла менавіта праблема фартыфікацыі?*

Таму што гэта “белая пляма” ў гісторыі Беларусі. Абсалютна маладаследаваная праблема, асабліва па XIX–XX ст.

*Наколькі дапамагла археалогія ў вывучэнні гісторыі фартыфікацыйнага будаўніцтва ў Беларусі?*

Падчас палявых даследаванняў былі прыменены археалагічныя метады; яны паспрыялі атрыманню больш поўных і дакладных дадзеных.

*Дык якая ж роля і месца беларускіх зямель у сістэме фартыфікацыйнага будаўніцтва Расійскай імперыі?*

Роля была вельмі важная ў тым сэнсе, што беларускія землі разглядаліся ўладамі: і царскімі, і савецкімі, як перадавы тэатр ваенных дзеянняў, таму будаўніцтва фартыфікацыйных збудаванняў было адным з прыярытэтных элементаў падрыхтоўкі як абарончай, так і наступальнай вайны. Беларусь была важным звяном у гэтай падрыхтоўцы.

*Якая роля адводзілася Беларусі ў гэтай сістэме ў савецкі перадваенны час?*

Зноў жа, адзін з першых умацаваных раёнаў быў пабудаваны у Полацку і Мазыры. Калі перад вайной прынялі рашэнне будаваць новую фартыфікацыйную сістэму, заснаваную на новых еўрапейскіх прынцыпах і стандартах, то з чатырох першых умацаваных раёнаў па ўсяму СССР два былі пабудаваны ў Беларусі. Гэты быў вельмі важны накірунак, і савецкія ўлады разумелі значэнне Беларусі ў вядзенні будучых войнаў, у экспансіі сацыялістычнай рэвалюцыі ў капіталістычны свет.



*Якія вашы далейшыя творчыя планы?*

Рыхтую нарысы гісторыі фартыфікацыі Беларусі ад старажытнасці да сучаснасці (нават атамная фартыфікацыя). Наступнае – буду працягваць даследаванне асобных фартыфікацыйных комплексаў, больш поўнае даследаванне фартыфікацыйных сістэм.

***Інтэрв’ю браў С.Марозаў***

## “Леў Сапега (1557–1633 г.) і яго час”

Міжнародную навуковую канферэнцыю пад такой назвай арганізуе 4 красавіка 2007 г. гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы

Буйны дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, дыпламат Леў Сапега (4.4.1557, в. Астроўна Віцебскага павета – 7.7.1633) – знакавая постаць беларускай і еўрапейскай гісторыі, рэдактар перадавога помніка еўрапейскай прававой думкі XVI в. Статута ВКЛ, ініцыятар саюза ВКЛ з Рускай дзяржавай, мецэнат, адзін з багацейшых дваран Еўропы.

Навуковая і грамадская цікавасць да гэтай асобы не змяншаецца на працягу апошняга стагоддзя, з новай сілай яна ўзмацнілася з канца XX ст. Біяграфіяй, дзейнасцю, спадчынай Л.Сапегі цікавяцца гісторыкі, прававеды, філолагі, культуролагі, філосафы Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны.



У красавіку 2007 г. спаўняецца 450 гадоў з дня нараджэння Л.Сапегі. На канферэнцыі, якую з гэтай нагоды плануе кафедра гісторыі Беларусі, мяркуецца праца секцый па наступных напрамках: гістарыяграфія, крыніцы, унутраная палітыка, знешняя палітыка і дыпламатыя, грамадска-палітычнае жыццё, сацыяльна-эканамічнае развіццё, культура, рэлігія і царква, мова і літаратура, правы. На іх плануецца абмеркаваць эпоху другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. і ўсебакова – дзейнасць Льва Сапегі ў яе кантэксце як дзяржаўнага мужа, дыпламата, юрыста, мецэната, магната. На канферэнцыі адбудзецца круглы стол “Леў Сапега: роля асобы ў гісторыі”.

# Точка зрения

Первая задача историка – воздержаться от лжи; вторая – не утаивать правды; третья – не давать никакого повода заподозрить себя в пристрастии или в предвзятой враждебности.

*Цицерон*

Правда настигает лжецов и лжесвидетелей.

*Гераклит*

Те, кто творит историю, часто заодно и фальсифицируют ее.

*Веслав Будзиньский*

История повторяется дважды — сначала в виде трагедии, потом в виде фарса.

*Карл Маркс*

Счастлив народ, о котором редко упоминают исторические труды.

*Томас Карлейль*

Компетентный историк способен доказать историческую неизбежность любого события, после того как оно произошло.

*Ли Симонсон*

Лживых историков следовало бы казнить как фальшивомонетчиков.

*Мигель Сервантес*

Память противостоит уничтожающей силе времени.

*Дмитрий Лихачев*

Археологи выкапывают из земли историю, которую закопали политики.

*Габриэль Лауб*

Каждый может творить историю, но лишь великие люди способны ее писать.

*Оскар Уайльд*

Главный урок истории заключается в том, что человечество необучаемо

*Уинстон Черчилль*




История повторяется дважды, а переписывается гораздо чаще.

*Анатолий Рас*

Закон Уимса: Исторические заблуждения отличаются большей стойкостью, чем исторические факты.

*Мейсон Лок Уимс*

Мы живем в то доброе старое время, о котором так часто будет слышать следующее поколение.

*Из книги «Цитаты Питера»*

История учит, что все люди и все народы без исключения брались за ум не раньше, чем испробовав все другие альтернативы.

*Абба Эбан*

Субъективизм – обычное дело при отыскании объективных причин

*Лешек Кумор*

Заснавальнік: студэнцкі гісторыка-краязнаўчы гурток

**Рэдактар, а таксама дызайн, набор, вёрстка:**
**Сяргей Марозаў**

Кантактны адрас:
Гродна, 230003, вул. Шчорса, 38-70
***banifacyj@mail.ru; www.banifacyj.narod.ru***

Размножана на тэхніцы Установы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы”.

Электронны варыянт глядзіце на сайце:
***www.banifacyj.narod.ru/gurt***

Падпісана да друку 29 снежня, 2006
Наклад 50 паасобнікаў

**Распаўсюджваецца бясплатна**